Источник: "Настаўніцкая газета" - 2014-02-25

# Хто добра сее, той мае і добры ўраджай

## Да 60-годдзя слыннага мовазнаўца, доктара філалагічных навук, прафесара Васіля Дзянісавіча Старычонка

Кола навуковай дзейнасці Васіля Дзянісавіча Старычонка дастаткова шырокае: дыялекталогія, лексікалогія, лексікаграфія, міжмоўныя кантакты, полісемія, семантыка, культура маўлення і іншыя аспекты мовазнаўчай навукі.

В.Д.Старычонак з'яўляецца суаўтарам дзвюх фундаментальных акадэмічных прац: пяцітомнага "Слоўніка беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча" (Мінск, 1979—1986) і пяцітомнага "Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак" (Мінск, 1993—1998), які былі адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь у 2000 годзе. Значную ўвагу даследчык удзяляе выяўленню найбольш поўнага корпуса балтызмаў у беларускай мове і гаворках, характарыстыцы асноўных тыпаў запазычанняў з балтыйскіх моў. Ім складзены першы ў беларускай лексікалагічнай практыцы "Слоўнік балтызмаў у беларускай мове".

Мовазнавец працягвае і развівае семасіялагічны напрамак у беларускай лінгвістычнай навуцы, арыентаваны на даследаванні полісеміі і аманіміі. Практычнай рэалізацыяй канцэпцыі даследавання полісеміі і аманіміі і прынцыпаў класіфікацыі амонімаў і полісемантаў сталі першыя ў беларускай лінгвістычнай навуцы фундаментальныя працы В.Д.Старычонка "Слоўнік амонімаў беларускай мовы" (Мінск, 1991), "Слоўнік метафар беларускай мовы" (рукапіс), манаграфіі "Полісемія ў беларускай мове (на матэрыяле субстантываў)" (Мінск, 1997), "Метафара ў беларускай мове" (Мінск, 2007). Асноўныя палажэнні манаграфіі "Полісемія ў беларускай мове (на матэрыяле субстантываў)" былі выкладзены ў якасці доктарскай дысертацыі, якую В.Д.Старычонак з поспехам абараніў у студзені 1998 года.

У 90-я гады Васіль Дзянісавіч выкладаў беларускую літаратуру на падрыхтоўчых курсах розных мінскіх ВНУ. Тады і задумаўся, як дапамагчы юнакам і дзяўчатам добра здаць экзамен, як паказаць магчымыя шляхі вывучэння экзаменацыйных пытанняў, застрахаваць ад традыцыйных памылак, пазбегнуць літаратурных "рыфаў". На жаль, гэтыя і многія іншыя пытанні ў той час заставаліся пытаннямі без адказаў нават у той невялікай колькасці кніг па беларускай літаратуры, адрасаваных менавіта абітурыентам. І як выйсце са складанага становішча можна лічыць першыя публікацыі В.Д.Старычонка па гэтай тэме — тры выпускі метадычных парад і рэкамендацыі абітурыентам, якія ў 1993 годзе ў выдавецтве "Вышэйшая школа" выйшлі асобнай кніжкай пад назвай "Беларуская літаратура: дапаможнік для абітурыентаў". Лёс кнігі, на думку самога аўтара, быў шчаслівы: з рознымі дапаўненнямі і ўдакладненнямі яна перавыдавалася больш як 10 разоў.

Своеасаблівым абагульненнем работ па беларускай літаратуры, вынікам шматлікіх пошукаў у вырашэнні метадычных задач можна лічыць кнігу-даведнік В.Д.Старычонка "Беларуская літаратура: ад А да Я" (Мінск, 1998, 2000). Гэта першая ў беларускім літаратуразнаўстве энцыклапедычнае выданне, у якім поўна і ўсебакова адлюстраваны матэрыялы па гісторыі беларускай літаратуры, змесце твораў мастацкай літаратуры (іх тэматычнай і сюжэтнай накіраванасці, жанравай і родавай прыналежнасці), літаратурных жанрах, мастацкіх метадах, стылях, эпохах, літаратуразнаўчых тэрмінах, жыццёвым і творчым шляху многіх пісьменнікаў і інш.

З мэтай заахвоціць вучняў да вывучэння мовы і літаратуры, пашырыць іх кругагляд і моўную эрудыцыю, дапамагчы ў развіцці вобразнага і лагічнага мыслення, памяці, кемлівасці Васілём Дзянісавічам была створана кніга "Займальная філалогія" (Мінск, 1998). У ёй змешчаны самыя разнастайныя формы філалагічных задач і гульняў: крыжаванкі, чайнворды, крыптаграмы, віктарыны, анаграмы, галаваломкі, якія лічацца своеасаблівай разумовай гімнастыкай і робяць звычайную штодзённую работу цікавай і насычанай.

Як дэкан факультэта беларускай і рускай філалогіі В.Д.Старычонак удзяляе вялікую ўвагу выкладанню беларускай і рускай моў ва ўмовах беларуска-рускага білінгвізму, клапоціцца пра стварэнне інавацыйных дапаможнікаў па рускай мове. З'яўляецца суаўтарам кніг у трох частках "Современный русский язык" (Мінск, 1990, 1992, 1994), аўтарам кніг "Основы фонологии" (Мінск, 1999)

Мікалай Крыўко. Хто добра сее, той мае і добры ўраджай

Источник: "Настаўніцкая газета" - 2014-02-25

**Васіль Дзянісавіч СТАРЫЧОНАК**
Нарадзіўся 24 лютага 1954 года ў вёсцы Луцішча Крупскага раёна. Пасля заканчэння сярэдняй школы Васіль Дзянісавіч паступіў на філалагічны факультэт БДУ і ўжо ў студэнцкія гады праявіў сябе як удумлівы, улюбёны ў філалагічныя навукі студэнт. Ён актыўна ўдзельнічаў у маладзёжным руху, усе 5 гадоў вучобы быў старастам групы, адказваў за арганізацыю будаўнічых атрадаў у Малдавію. У 1976 годзе Васіль Дзянісавіч скончыў з адзнакай філалагічны факультэт БДУ і з верасня пачаў працаваць у Інстытуце мовазнаўства АН БССР. З 1982 года працуе ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка, спачатку — старшым выкладчыкам, пасля — дацэнтам, прафесарам кафедры, а з ліпеня 2001 года — дэканам факультэта беларускай і рускай філалогіі.



і “Русский язык: лингвистические анализы” (Мінск, 1999), слоўніка-даведніка “Русский язык. Школьный словарь-справочник” (Мінск, 2002). Васіль Дзянісавіч стаў ініцыятарам стварэння серыі шматлікіх вучэбных дапаможнікаў па рускай мове, у якіх выступіў у якасці навуковага рэдактара і суаўтара: “Современный русский язык” (Мінск, 1999), “Современный русский язык. Синтаксис. Пунктуация” (Мінск, 2004), “Современный русский язык: морфология” (Мінск, 2010), “Современный русский язык: синтаксис” (Мінск, 2012), “Современный русский литературный язык” (Мінск, 2012) і інш.

У 2008 годзе ў выдавецтве “Феникс” (Растоў-на-Доне) апублікаваны “Большой лингвистический словарь” В.Д.Старычонка (аб’ём даведніка — 812 кніжных старонак). Слоўнік уключае тлумачэнне звыш трох тысяч лінгвістычных тэрмінаў і паняццяў.

Вялікай папулярнасцю карыстаецца дапаможнік В.Д.Старычонка “Деловое общение и речевая культура современного преподавателя” (Мінск, 2010). У 2013 годзе кніга выйшла ў перакладзе на кітайскую мову.

Цяпер Васіль Дзянісавіч Старычонак завяршае работу над унікальным “Слоўнікам метафар беларускай мовы”, працуе над манаграфіяй па другасных семантычных найменнях, цыклам работ па дыстанцыйным і модульным навучанні, над некалькімі падручнікамі.

За больш чым 35 гадоў навукова-педагагічнай дзейнасці мовазнавец узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, знакам “Выдатнік адукацыі” Рэспублікі Беларусь, шматлікімі ганаровымі граматамі.

З нагоды юбілею жадаем шаноўнаму Васілю Дзянісавічу моцнага здароўя, поспехаў, творчага натхнення, здзяйснення запаветных жаданняў, таленавітых і ўдзячных вучняў, новых навуковых адкрыццяў.

**Мікалай КРЫЎКО,**
**вядучы навуковы супрацоўнік**
**Цэнтра даследаванняў беларускай**
**культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.**